# ВЯЛІКАЯ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ

## БСЖ: аб мінулым і будучыні

**У Жодзіне прайшла справаздачна-выбарчая канферэнцыя Мінскага абласнога аб'яднання «Беларускі саюз жанчын», на якой падвялі вынікі работы і акрэслілі арыенціры на будучыню.**

Мерапрыемства стала своеасаблівай рэпетыцыяй да рэспубліканскай канферэнцыі Беларускага саюза жанчын, што адбудзецца ў снежні. **Святлана СІТНІКАВА — старшыня Мінскага абласнога грамадскага аб'яднання БСЖ** падзялілася з удзельнікамі сходу дасягненнямі апошніх гадоў:

— У нашай вобласці 22 раённыя і 2 гарадскія аб'яднанні, у якія ўваходзіць больш за трынаццаць тысяч жанчын. Мы ўдзяляем вялікую ўвагу ўмацаванню інстытута сям'і ў грамадстве. Добрай традыцыяй стала правядзенне дабрачынных акцый «Нашы дзеці», «Здароўе жанчыны — здароўе нацыі», "Зборам заплечнік разам». Адным з важных кірункаў дзейнасці аб'яднання з'яўляецца далучэнне жанчын да актыўнага кіравання дзяржаўнымі і грамадскімі справамі.

Разам з тым праблем яшчэ шмат. Абвастраецца крызіс інстытута сям'і — амаль палова заключаных шлюбаў распадаецца. Сур'ёзнай праблемай застаецца жаночае беспрацоўе ва ўсіх раёнах вобласці, асабліва ў малых гарадах і вёсках. Але жанчыны ўпэўнены, разам яны змогуць вырашыць усе набалелыя пытанні.

На канферэнцыі прысутнічала і Алена Козырава, кіраўнік Салігорскага раённага савета жанчын. Яе намаганнямі арганізацыя стала адной з самых выдатных не толькі ў вобласці, але і ва ўсёй краіне. Жанчына завітала на свята не з пустымі рукамі. Яна прывезла ў падарунак кнігу-альбом «Светлы воблік Салігоршчыны», выданне якой прымеркавана да 25-годдзя Беларускага саюза жанчын.

У той жа дзень быў абраны і новы склад праўлення. **Сустаршыня БСЖ Антаніна МОРАВА** параіла яго ўдзельніцам больш актыўна ўключацца ў грамадскае жыццё краіны:

— Нам патрэбны найлепшыя жанчыны, якія хочуць нешта змяніць. Разам за квітнеючую Беларусь — гэтыя словы павінны стаць дэвізам нашай жаночай работы!

Яшчэ адным важным пытаннем канферэнцыі стаў выбар новага кіраўніка абласнога аб'яднання. Ім стала **Святлана САРОКА — дырэктар Палаца культуры горада Маладзечна.** Яна вельмі хутка завявала прызнанне і павагу сваіх сяброўак па грамадскім аб'яднанні, як сапраўдны лідар і ініцыятар многіх добрых і карысных спраў. Ужо ў новай ролі старшыні Святлана Сарока шчыра падзякавала ўсім за давер і добрыя словы:

— Спадзяюся, што разам мы будзем працаваць вельмі адказна і аддана. Прафесіяналізм, любоў да справы, дабрыня, чуласць — гэтаму вучылі мяне бацькі, настаўнікі, сябры. Менавіта такімі якасцямі я кіруюся ў сваёй рабоце.

Афіцыйная частка сходу заняла некалькі гадзін. Пасля ў нефармальнай абстаноўцы самым актыўным жанчынам уручылі ганаровыя граматы і кветкі.

**Хрысціна ХІЛЬКО.**

■ Партнёрства

# Ад механіка — да праграміста

## Беларусь дапаможа рыхтаваць спецыялістаў для Пакістана

**Рашэнне аб стварэнні сумеснай беларуска-пакістанскай навучальнай установы — Універсітэта прафесійнай адукацыі — было прынятае па выніках візіту ў Беларусь генеральнага дырэктара арганізацыі Roots International Schools (Ісламская Рэспубліка Пакістан) Валіда МУШТАКА.**



Фота БЕЛТА.

Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Міхаіл Жураўкоў і Валід Муштак падпісалі Мемарандум аб узаемаразуменні, які ўключае шэраг кірункаў двухбаковага супрацоўніцтва: абмен педагагічнымі работнікамі з кола прафесарска-выкладчыцкага саставу, магчымасць аплаты навучання пакістанскіх студэнтаў у Беларусі і беларускіх студэнтаў — у Пакістане, стажыроўкі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў...

Як расказаў беларускім журналістам спадар Муштак, Roots International Schools — недзяржаўная арганізацыя. У сферу яе ўплыву трапляюць больш як 30 тысяч дзяцей са 100 школ з 30 гарадоў.

— Мы даём нашым вучням не проста кніжныя веды, а развіваем у дзяцей крытычнае і аналітычнае мысленне, стымулюем развіццё ў іх фантазіі, нестандартнае бачанне свету — гэта значыць, даём ім тыя навыкі, якія патрабуюцца ў XXI стагоддзі і праграмістам, і сацыёлагам, і ўрачам, і прадстаўнікам усіх іншых прафесій, каб быць паспяховымі. Гэта становіцца магчымым дзякуючы ўкараненню ў адукацыйны працэс інавацыйных праектаў: больш як 2 тысячы нашых педагогаў працуюць з дзецьмі па самых перадавых тэхналогіях. З дапамогай адукацыі мы змяняем лёсы маладых людзей і натхняем іх на новыя здзяйсненні. За два апошнія гады каля 30 мільёнаў долараў было накіравана на стыпендыі, якія дазваляюць маладым людзям з Пакістана атрымліваць вышэйшую адукацыю ў вядучых універсітэтах свету – Гарвардзе, Оксфардзе, Лонданскай школе эканомікі, універсітэтах Аўстраліі і Канады.

Адзін з самых уплывовых пакістанскіх бізнесменаў, Валід Муштак атрымаў запрашэнне наведаць Беларусь у ходзе нядаўняга візіту беларускай урадавай дэлегацыі ў Ісламскую Рэспубліку Пакістан. За некалькі дзён знаходжання ў нашай краіне ён азнаёміўся з усімі ўзроўнямі адукацыі: ад дашкольнай — да вышэйшай.

Універсітэт прафесійнай адукацыі, які будзе створаны пры дапамозе беларускага боку, дазволіць маладым людзям атрымаць універсальныя навыкі, каб стаць запатрабаванымі і канкурэнтаздольнымі на рынку працы паўсюдна.

— Мадэль падрыхтоўкі спецыялістаў з прафесійнай адукацыяй (і праграмы, і тэхналогіі, і інфраструктура), якую я ўбачыў у Беларусі, — узор для пераймання, — канстатаваў Валід Муштак. — Гэта будзе ўстанова, якая не толькі дапаможа маладым людзям стаць добрымі механікамі, будаўнікамі, дызайнерамі, праграмістамі, спецыялістамі аўтамабільнай вытворчасці, але паспрые культурнаму абмену паміж нашымі краінамі, узаемадзеянню і ў іншых сферах.

Гаворачы пра новую ўстанову, Міхаіл Жураўкоў дадаў, што ў партнёраў ёсць жаданне, каб універсітэт працаваў не толькі на Пакістан, але і на ўвесь усходні рэгіён, а таксама на Кітай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Развітанне

# АПОШНЯЯ ВОСЕНЬ ПАТРЫЯРХА

## Памёр найстарэйшы дзеючы акцёр планеты



**Уладзімір Зельдзін стаў першым тэатральным акцёрам, які прадоўжыў іграць на сцэне па дасягненні стогадовага ўзросту. Ён лічыўся найстарэйшым — з тых, што працягваюць працаваць, — акцёрам свету. Свой стогадовы юбілей і сто першы дзень нараджэння адзначыў на сцэне тэатра Расійскай Арміі, куды прыйшоў яшчэ ў 1945-м — тэатральная кар'ера Зельдзіна доўжылася больш за семдзесят гадоў. Ён памёр раніцай 31 кастрычніка на сто другім годзе жыцця ў НДІ імя Скліфасоўскага.**

Яшчэ ў 1940-м, калі Уладзімір Зельдзін іграў у спектаклі Тэатра транспарту, яго заўважыла асістэнтка небезвядомага рэжысёра Івана Пыр'ева — так малады акцёр атрымаў сваю першую сур'ёзную кінаролю. Гэта быў музычны фільм «Свінарка і пастух» — карціна, якая ўсхваляла яднанне народаў Савецкага Саюза — Зельдзін сыграў у ёй дагестанскага пастуха Мусаіба Гатуева.

Падчас здымак у 1941 годзе 26-гадоваму акцёру прыйшла павестка з запрашэннем на фронт, танкістам. Але раптоўнае пастанаўленне Камітэта па кінематаграфіі прызначыла скончыць важную для таго часу карціну (акцёр быў нават упэўнены, што рашэнне прыняў асабіста Іосіф Сталін), а гэта азначала, што замест ваеннага пекла хлопец разам са здымачнай групай павінен быў адправіцца ў Казахстан.

Уладзімір Зельдзін вядомы таксама па ролях у фільмах «Аповесць палымяных гадоў», «31 чэрвеня», «Карнавальная ноч», «Дзядзька Ваня», «Дуэнья» і іншых, апошнім часам прымаў удзел у здымках тэлесерыялаў. Але ўсё ж найгалоўнейшым прызваннем і прызнаннем для акцёра стаў лічыў тэатр, на свой апошні дзень нараджэння ён сыграў у прысвечаным яму ж спектаклі «Танцы з настаўнікам». У 1975 годзе акцёру было прысвоена званне народнага артыста СССР.

Пахаваны Уладзімір Зельдзін будзе 3 лістапада на Новадзявочых могілках у Маскве.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Першае снежнае покрыва

## На працягу тыдня сярэднясутачная тэмпература будзе вагацца ад мінус 7 да плюс 9 градусаў

**Ужо з першых дзён лістапада на тэрыторыю Беларусі завітае сапраўдная хваля «маладой» зімы, калі мокры снег з дажджом усё часцей будзе чаргавацца з мокрым снегам і проста снегам. На працягу тыдня будзе ветрана, халодна і золка, калі на большай частцы тэрыторыі ляжа няўстойлівае снежнае покрыва, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Сёння ўдзень пераважна па заходняй частцы краіны прагназуюцца мокры снег і дождж. Максімальная тэмпература паветра складзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 6 цяпла. А вось прыкладна з серады, з паўночнага захаду да нас прыйдзе новы цыклон, які будзе перамяшчацца праз паўночныя раёны Беларусі. У сераду амаль без перапынку будзе ісці мокры снег, які часам пачне пераходзіць у дождж. У асобных раёнах прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с, а ўначы і раніцай магчымы слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны чакаецца да 6 цяпла. Удзень плануецца ад нуля да плюс 7 градусаў, па паўднёвым захадзе ў асобных раёнах — да 9 цяпла. Дождж і мокры снег прагназуюцца паўсюдна і ў чацвер. У асобных раёнах магчымы слабы галалёд, а ўначы і раніцай прагназуецца туман. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 1 градуса да 5 цяпла. У пятніцу на большай частцы тэрыторыі надвор'е крыху супакоіцца, бо кароткачасовы мокры снег чакаецца толькі месцамі. Уначы і раніцай на асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу разам з ростам атмасфернага ціску надвор'е крыху палепшыцца. Толькі ўначы ў асобных раёнах, а ўдзень — пераважна па заходняй частцы краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы і мокры снег. Уначы і раніцай прагназуецца слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да 7 градусаў марозу, удзень — ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла. Але ўжо ў нядзелю да нас завітае чарговы цыклон, які будзе рухацца з боку паўднёвага захаду Еўропы і прынясе на большую частку краіны мокры снег і дождж. Ізноў уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы галалёд. Прагназуецца, што тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а па паўночным усходзе — да 6 марозу. Удзень чакаецца ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла. Не вельмі здаровае надвор'е атрымліваецца.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Аты-баты

# ПЕРШЫ КРОК ДА МАРЫ

## У Інстытуце пагранічнай службы адбыўся Дзень адкрытых дзвярэй

**Такой колькасці патэнцыйных абітурыентаў, якія прыйшлі ў навучальную ўстанову ў гэтую суботу, ніхто з арганізатараў нават не чакаў. Прычым з той паўтысячы чалавек, што з'ехаліся сюды з розных рэгіёнаў краіны, палову (калі не больш) складалі дзяўчаты.**



Фота Аляксандра КАЛАБАВА.

Хутчэй за ўсё, гэта звязана з тым, што сёлета ўпершыню за гісторыю гэтай навучальнай установы ў Інстытут пагранічнай службы набралі дзяўчат. Цяпер яны спасцігаюць азы спецыяльнасці «Кіраванне падраздзяленнямі пагранічнага кантролю». У наступным годзе дзяўчатам таксама прапануюць стаць курсантамі ўстановы. Праўда, мяркуецца, што як і сёлета, конкурс будзе вялікі — у 2017 годзе на курсантаў жаночага полу адведзена ўсяго пяць вакантных месцаў.

Падчас Дня адкрытых дзвярэй школьнікі пазнаёміліся з вучэбна-матэрыяльнай базай інстытута, пабывалі ў курсанцкіх пакоях, каб на свае вочы пабачыць, як наладжаны побыт будучых абаронцаў нашых межаў. Бліжэй пазнаёміцца з прафесіяй можна было дзякуючы макету дзяржаўнай мяжы, які дазваляе мадэляваць сітуацыі, што адбываюцца ў рэальным жыцці.

У холе культурна-забаўляльнага цэнтра ўстановы разгарнулася выстаўка ўзораў узбраення. Курсанты правялі для наведвальнікаў майстар-класы па разборцы і зборцы зброі. Жадаючыя прайшлі прафарыентацыйнае псіхалагічнае кансультаванне для вызначэння найбольш адпаведнага па індывідуальна-псіхалагічных характарыстыках кірунку прафесійнай дзейнасці. У прыватнасці, кожны мог праверыць сябе на схільнасць да ваеннай справы.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*